# ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ

19 красавіка 2024 года

На пасяджэнні камісіі прысутнічаюць: Дзімтрый Лазавік, Яраслаў Бекіш, Алена Прыходзька, Алена Філатава.

У сілу п. 4.11 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную Раду для прыняцця рашэнняў неабходны кворум павінен складаць 2/3 ад колькасці чальцоў Выбарчай камісіі. Неабходная колькасць сябраў Выбарчай камісіі прысутнічае – 4 чалавекі. Кворум выкананы.

Паседжанне Выбарчай камісіі аб'яўляецца адкрытым.

На пасяджэнні Выбарчай камісіі прысутнічаюць сябры Выбарчай камісіі з правам голасу, а таксама сябры сакратарыята Выбарчай камісіі, якія з'яўляюцца непублічнымі асобамі, аказваюць тэхнічную дапамогу Выбарчай камісіі, у тым ліку складаюць пратакол пасяджэння Выбарчай камісіі, аднак правам галасы не валодаюць.

**Парадак дня:**

1. Зацвярджэнне парадку дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 19 красавіка 2024 года.
2. Абвяшчэнне назваў спісаў, якія паступілі ў Выбарчую камісію.
3. Допуск назіральнікаў за выбарамі.
4. Допуск да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў.
5. Допуск да выбараў беларусаў, якія маюць два і больш грамадзянства.
6. Спіс "Закон і Правапарадак". Ці можна яго лічыць парамілітарным?

**Разгляд пытання №1.**
Зацвярджэнне парадку дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 19 красавіка 2024 года.
Заўваг ад сяброў выбарчай камісіі не паступіла.
Па пытанні № 1 прагаласавалі:
"За" - 4 галасы, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць парадак дня пасяджэння Выбарчай камісіі на 19 красавіка 2024 года.

**Разгляд пытання №2.**

СЛУХАЛІ: Старшыня Выбарчай камісіі Алена Прыходзька абвясціла спісы, якія паступілі ў Выбарчую камісію:

“Прыём спісаў пачаўся ад 15 красавіка і на дадзены момант да нас накіравалі тры спісы ад выбарчых суб’ектаў і іх лідараў. Гэта спіс “Салідарнасць” – ад аб’яднання партый “Народная грамада” і беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў. Лідарам спіса з’яўляецца спадар Георгій Дмітрук. Другі спіс называецца “Закон і правапарадак”, ад былых супрацоўнікаў сілавых ведамств. Лідар спіса – спадар Аляксандр Азараў. І трэці спіс пад назвай “Незалежныя беларусы”. Лідар спісу – спадар Максім Шабуцкі. Бягучы стан спісаў пасля таго як Выбарчая камісія іх ужо апрацавала. Спіс “Незалежныя беларусы” Выбарчая каміссія разглядзела і да яго і пакету дакументаў значных заўвагаў не мае, і гэты спіс пасля гэтага пасяджэння прасоўваецца на наступны крок, яму надаецца адпаведны верыфікацыйны код і гэты спіс рухаецца далей па працэдуры. Спіс “Салідарнасць” таксама прайшоў папярэднюю праверку, да самога спісу ў нас ніякіх заўвагаў няма. Выбарчая камісія запытала ў працоўным парадку дадатковыя звесткі ў адпаведнасці з пунктам 3.3 Палажэння аб выбарах і, я думаю, хуткім часам мы атрымаем адказ ад лідара спіса “Салідарнасць”. Спіс “Закон і правапарадак” сёння будзе разглядацца на сённяшнім пасяджэнні і адпаведна вынікаў гэтага разглядання будуць далей абвешчаны нашыя дзеянні і дзеянні, якія будуць чакацца ад лідара спіса, калі гэта будзе патрэбна. Я хачу яшчэ дадаць, што мы вітаем і дзякуем першым кандыдатам і выказваем ім падзяку, просім аператыўна заставацца на сувязі, каб вырашаць пытання па недахопах. Просім вас, Шаноўнае Спадарства, заклікаю вас як Старшыня да канструктыву, не успрымайце нашыя заўвагі як нейкія асабістыя дакоры, і мы, і вы хацім, што б ўсё у нас адбылося адпаведна палажэнняў і правілаў. Таму, калі ласка, і вы задавайце пытанні і выпраўляйце хібы, і мы са свайго боку таксама будзем выпраўляць недахопы, калі яны будуць, і спрыяць таму, каб вашыя спісы патрапілі да выбаршчыкаў адпаведна правілаў і рэгламентаў у терміны, якія для гэтага выдзелены. І дзякуй усім за увагу і працу. Па гэтым пытанню галасаванне у нас не праводзіцца. Таму пераходзім да наступнага пытання.

**Разгляд пытання №3.**
СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Дзмітрыя Лазавіка па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Што тычыцца допуска назіральнікаў і празрыстасці хачу адзначыць, што згодна з Палажэннем аб выбарах, выбары мусяць быць празрыстымі, да нашых пасяджэнняў мусяць быць дапушчаны прадстаўнікі СМІ і выбарчых суб’ектаў, таму я прапаную да гэтага пытання наступнае рашэнне. Дапускаць усіх назіральнікаў, прадстаўнікоў выбарчых суб’ектаў, прадстаўнікоў сродкаў

массавай інфармацыі, у сувязі з тым, што мы збіраемся анлайн, яны таксама мусяць падлучацца анлайн і пытанні адрасавьць да сакратарыяту, каб яны знайшлі неабходнае тэхнічнае рашэннее да гэтага допуску, і акрамя проста допуску, каб да нас не прыходзілі ананімы, альбо нейкія невядомыя людзі. Трэба рабіць мінімальную верыфікацыю: запісваць хто прыходзіць, ад каго прыходзіць, і адпаведна дапускаць, альбо не дапускаць да пасяджэнняў. І што тычыцца назірання, выбары будуць праходзіць ў электронным выглядзе анлайн. То бок, да чаго дапускаць назіральнікаў, ці паказваць ім код, ці кавалкі коду, праграммы, гэта трэба дадаткова вызначыць пасля кансультацый з тэхнічнымі спецыялістамі. Вось такая мая прапанова.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Маё пытанне будзе з двух частак. Першае, Зьміцер, вы прапануеце дапускаць прадстаўнікоў назіральнікаў да нашых анлайн-сустрэч у рэжыме верыфікацыі. Я думаю пра акрэдытацыю. Ці мусім мы стварыць папярэднюю акрэдытацыю, каб мы маглі вырашыць і даць гэтыя паўнамоцтвы для пула людзей і прадстаўнікоў тых суб’ектаў, якіх мы хацелі б запрасіць, альбо якія самі хацелі б далучыцца? Каб гэта не адбывалася напярэданні нашых паседжанняў. Мая прапанова зрабіць так.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Дзмітрыя Лазавіка па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Я цалкам згодны. Мусіць быць нейкі тэрмін, каб мы тэхнічна паспелі падлучіць. Па-другое, сёння нашы паседжанні транлююцца, таму ўсе могуць назіраць у рэжыме анлайн. Тобок можна пускаць альбо сюды у зум пасля акрэдытацыі, альбо кожны можа назіраць гэта ў рэжыме анлайн.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Я спадзяюся, што толькі сёння ў нас атрымоўваецца, што мы не ў прамым эфіры, але мая прапанова ў тым каб мы маглі акрэдытаваць. Прычым не кожны раз на кожнае пасяджэнне, а адзін раз, і каб людзі маглі далучацца на ўсе пасяджэнні. Гэта, што тычыцца анлайн-форм. У мне таксама ёсць прапанова якую мы з вамі яшчэ не абмяркоўвалі. Прапанова, каб мы маглі падчас выбараў гэта тры апошнія дні працаваць оффлайн, калі мы знойдзем такую тэхнічную і фінансавую магчымасць сабрацца і працаваць разам у адным памяшканню ці ў двух. Калі я кажу пра адно, то я маю на ўвазе ў адным горадзе, каб людзі маглі да нас прыйсці, каб назіральнікі маглі прыйсці, каб журналісты маглі і

ўсе астатнія, каго мы акрэдытуем. Альбо альтэрнатыўная прапанова – зрабіць гэта ў двух гарадах: Варшаве і Вільне, тры на тры. Пры ўмовах, што мы на гэтае ўсе пагадзімся. Калі мы зможам аплаціць гатэль і каву. Зразумела, што праца наша безкаштоўная.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Я насамрэч не бачу праблемы ў гэтым, мне падаецца наадварот, чым мы больш каммуніцыруем з нашымі грамадзянамі, гэта толькі дае бонус, і на будучыню гэта дае давер да выбарчай камісіі, таму мне вельмі падабаецца гэта прапанова.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Ці будзем мы ўводзіць мараторый на агітацыю падчас выбараў? Я ўвогуле падтрымліваю вашу ідэю. Папярэдняя пытанне: ці мы гэтага жадаем? Мы можам вырашыць ў чацьверох, але трэба пракансультавацца з тымі каллегамі, каторыя сёння да нас не далучыліся. Па-другое, у якім выглядзе мы можам гэта арганізаваць, наколькі я разумею трое з чальцоў камісіі знаходзяцца ў Варшаве і было б лагічна, каб там не было выдаткаў лішніх знайсці такое памяшканне. Я гатоў прапанаваць, мне трэба крыху пашукаць, але ёсць прапановы з рознымі беларускімі цэнтрамі, каб мы маглі там працаваць. А ў Вільне трэба будзе знайсці, але я не ведаю колькі людзей жыве ў Вільне.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“У нас ёсць магчымасць надаць памяшканне безкаштоўнае і там будзе і кава і гарбата. Калі з’явіцца ў кагосці жаданне ў Вільні сустрэць гэтыя дні, калі ласка, звяртайцеся мы дапаможам.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Гэта будзе праца. Я маю на ўвазе працоўны дзень. Па гэтым пытанні нам трэба будзе прыняць рашэнне. Я прапаную пакуль не прымаць, а дайсці праз яго да назіральнікаў. То бок, калі ў нас атрымаецца зрабіць такі оффлайн-фармат, зразумела, што мы туды назіральнікаў запрашаем. Ёсць яшчэ лічбавы фармат пра які Дзмітрый казаў. Пра тое што мы ж будзем не падлічваць галасы, а верыфікаваць тое, як гэты падлік праходзіць. І вось гэтае яшчэ нам

трэба будзе ўзгадніць у платформы Новай Беларусі, як мы можам да гэтага працэсу дадаць назіральнікаў, каб гэта сапраўды было не тое, што яны чытаюць код. Хоця, можа і патрэбна чытаць код, но якім чынам гэта будзе слушна арганізавана.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Дзмітрыя Лазавіка па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Я прапаную па допуску назіральнікаў у лічбавым фармаце назіральнікаў, прадстаўнікоў СМІ, прадстаўнікоў выбарчых суб’ектаў, я прапаную прынцыпова прагаласоваць “ЗА” допуск у такім аб’ёме, які не будзе пагражаць бяспецы ўсіх удзельнікаў выбарчага працэсу. У максімальна поўным аб’ёме без пагрозы ўдзельнікам выбарчага працэса. Калі мы нейкую частку запусцім у оффлайн-фармаце, то таксама пасля акрэдытацыі мы зможам дапусціць назіральнікаў і прадстаўнікоў. Прапаную акрэдытацыю рабіць у максімальна простай форме.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“У простай і празрыстай форме. Згодна з тым, што вы, калегі, сказалі. Нагадаю, што ўся праца Выбарчай камісіі адбываецца ў анлайн-фармаце, тобок мы фізічна нічога не атрымліваем, нічога не перадаем. За гэтым працэсам назіраць немагчыма, таму што правіла бяспекі. Мы маем доступ да дакументаў з чуллівай, прыватнай інфармацыяй і дзеліцца гэтым доступам з іншымы людзьмі мы проста не маем права, таму што мы адпаведную дамову падпісвалі. Мы звязаны абавязкамі. Гэта трэба разумець. На гэтым этапе назіраць я не зусім разумею, як гэта магчыма. Што тычыцца нашых адкрытых пасяджэняў, альбо іншай нашай дзейнасці публічнай, то канешне яна максімальна празрыста і калі хтосьці хоча да яе далучацца без права голаса як удзельнік пасяджэння, калі ласка. Што тычыцца магчымасці назіраць за ходам падлікаў галасоў, таму што ўчора такое пытанне ўздымалася на кансультацыі ад прадстаўніка выбарчага суб’екта, людзі хочуць назіраць увогуле, як галасаванне адбываецца і самае галоўнае, як падлічваецца. Гэта ж галоўны страх белрусаў. То тут, яшчэ раз нагадаю, само галасаванне адбываецца анлайн з розных кропак і бакоў. І гэта дэцэнтралізавана агульна, агульнага такого сервера на якой паступае інфармацыя, дзе яна апрацоўваецца не існуе. Па-другое, у нас ёсць тэхнічная магчымасць як у чальцоў Выбарчай камісіі назіраць і у тэставым фармаце спрабаваць паглядзець, як працуе працэс падліку галасоў. Вось на гэтым этапе, калі мы зробім аффлайн-мерапрыемства, я бачу чалкам магчыма, каб падчас гэтага працэсу прысутнічалі вонкавыя назіральнікі. Тут я праблемаў не бачу. Тут мы ўпіраемся ў неабходнасць

дзесьці оффлайн фізічна збірацца, каб гэтыя назіральнікі маглі да нас далучыцца. Альбо калі такой магчымасці не будзе, мы павінны тады прадумаць анлайн-варыянт, калі мы гэтыя тэставыя маніпуляцыі свае праводзім, ці мы гэта робім у прамым эфіры. Сёння прынцыпова мы галасуем за то, што назіральнікі нам патрэбны.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Дзмітрыя Лазавіка па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Кароткая заўвага. Мы абавязкова звернемся з гэтым пытаннем да распрацоўшчыка платформы, каб ён больш падрабязна разтлумачыў і нам у тым ліку, якія тэхналогіі яны выкарыстоўваюць, як гэта адбываецца, калі там ёсць нейкія open-source крыніцы, то ўсім гэтым падзяліцца, каб гэта падрабязна давесці да выбаршчыкаў.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі:

“Нам трэба занасіць рашэнне ў пратакол, але дадаецца ўсё больш аспектаў. У нас былі перамовы з Паўлам Ліберам, каб ён выйшаў у публічную прастору і распавёў, каб гэта не толькі мы рабілі, а ён і ягоныя калегі распавялі, як будзе працаваць гэтая сістэма, якія ёсць рызыкі, калі яны ёсць, як іх пазбягаць і хто несе адказнасць, калі штосці пойдзе ня так. Мы размаўлялі з Паўлам Ліберам аб тым, каб ён не проста разтлумачыў яшчэ раз пра тое, як працуе гэтая сістэма, але і как мы маглі прапісаць працэдуру верыфікацыі. У нас ёсць уяўленне, як гэта мы будзем рабіць, але я прапаную гэта зацьвердзіць рашэннем камісіі.”

Галасаванне па пытанні допуску назіральнікаў за выбарамі.

Па пытанні № 3 прагаласавалі:
"За" - 4 галасы, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Зацвердзіць магчымасць удзелу назіральнікаў за выбарамі.

**Разгляд пытання №4 і №5.**
СЛУХАЛІ: Сябру Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“У працессу верыфікацыі ў нас ёсць пытанні. Першы і галоўны крытэр для нас – гэта беларускі пашпарт, што сведчыць аб ты, што грамадзянін, грамадзянка з’яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. У сілу некаторых абставінаў мы бяром пад увагу іншыя дакументы, якія могуць сьведчыць аб тым, што асоба якая падаецца з’яўляецца грамадзянінам: любое пасьведчанне. У нас

таксама можа вынікнуць пытанне, што можа быць два грамадзянства, гэта грамадзянства іншай краіны і грамадзянства Рэспублікі Беларусь. Незалежна ад таго, у якой краіне знаходзіцца беларус, калі ён мае грамадзянства Рэспублікі Белрусь, тут у нас усе пытанні здымаюцца. Дапускаем яго ў спіс і да галасавання. Выключэнні для нас – гэта грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія самастойна вырашылі выйсці з грамадзянства Рэспублікі Беларусь і зараз з'яўляюцца ў працэссе альбо ўжо фактычна грамадзянамі іншай краіны. Калі яшчэ няма рашэння па грамадзянству іншай краіны, ён яшчэ дзейнічае як грамадзянін Рэспублікі Беларусь. У выпадку калі ўжо ёсць дакументы іншай краіны, нажаль гэта выключае ўдзел у выбарчым працэсе. У Беларусі адбываюцца рэпрэссіі, калі грамадзянін Беларусі з той ці іншай прычыны прымусова пазбаўляецца грамадзянства, мы гэта грамадзянства ўсё роўна залічваем і можам верыфікаваць гэтую асобу як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь."

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Ярослава Бекіша па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

"Я згодзен з усімі гэтымі прапановамі. У мяне толькі адно пытанне. У мене сітуацыя, што няма зараз пашпарта Рэспублікі Беларусь. Ён знаходзіцца ў службах краіны, ў якой я знаходжуся. На час выбараў яго не будзе. І таксама я разумею гэтую праблему. І я хацеў бы мець магчымасць удзельнічаць у выбарах таксама. Але ў той жа час, калі мы кажам пра рознага кшталту даведкі, якія будуць да нас паступаць. Ці мы разумеем дакладна, як іх верыфікаваць? Я неэфектыйныя думакументы, падробкі? Некаторыя такія дакуманты маюць дзяржаўную форму і іх амаль немагчыма падрабіць. Але калі прыйдзе папера с сіняй пячаткай, якую можна раздрукаваць на прынтэры, што мы будзем рабіць у такім выпадку? Ці ўжо ёсць у вас развагі на гэты конт?"

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

"З досьведу свайго я ведаю, што грамадзяне, якія не могуць вярнуцца, то Жэнеўскай канвенцыяй зацьверджана форма дакументу, то бок упершыню мы будзем кіравацца тымі формамі, якія зацьверджаны. Таксама можна спасылацца на Венецыянскую камісію, якая нам тлумачыць, хто ёсць грамадзянінам краіны. Адзінае я зараз не скажу, ці яны зацвердзілі формы. З нашага боку трэба будзе звярнуць увагу на тыя дзяржаўныя структуры, якія выдавалі гэтую паперу. І я перакантана, што на сайце кожнага з іх знаходзіца дакумент, як ён выглядае, якія адзнакі дакумента ёсць. Мінімальна можна звярнуць увагу на тыя адзнакі, якія сведчаць пра дакументы. Я кіруюся таксама палажэннем, якое дазваляе нам дадаткова запатрабаваць дакументы

для дадатковай верыфікацыі, то бок, калі ўзнікаюць сумневы ў арыгінальнасці дакумента, я лічу, што мы можам папрасіць асобу дадаткова падзьцвердзіць праз лісты.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Дзмітрыя Лазавіка па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“Даволі складанае пытанне, таму што ў нас у базавых дакументах вызначана, што ў спісы выбарчых суб’ектаў могут трапіць толькі і выключна грамадзяне Рэспублікі Беларусь. З другога боку, я на ўласным досьведзе ведаю, як гэта можа быць складана, таму што праз некаторы час мой пашпарт таксама знаходзіўся, як і у Яраслава ў дзяржаўным органе іншай краіны, і ўзамен гэтага пашпарту я атрымаў дакумент, дзе не было пазначала маё грамадзянства. Там толькі было напісана месца майго нараджэння. І тое ж самае, я зараз трымаю перад сабой Жэнеўскі пашпарт, там не напісана грамадзянства, там напісана мейсца нараджэння. Паважаныя каллегі, у нас ёсць права прыцягваць экспертаў. У найбольш складаных пытаннях, мы мусім прыцягнуць юрыстаў-міжнароднікаў да канчатковага адказу на гэтыя пытанні. Гэта тычыцца чальцоў спісаў выбарчых суб’ектаў. Што тычыцца непасрэдна выбаршчыкаў, то там я прапаную падыходзіць больш лаяльна. Аддаваць гэта выбаршчыкам і спадзявацца на іх дабрасумленнасць. Задзейнічаць сродкі верыфікацыі, якія нам будзе прапаноўваць тэхнічная каманда.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“Што тычыцца выбаршчыкаў, то мы ніяк паўплываць не можам і верыфікуем іх не мы, а штучны інтэлект. Мы верыфікуем выключна выбарчых суб’ектаў і чальцоў спісаў выбаршчых суб’ектаў.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“Па выбаршыках штучны інтэлект можа верыфікаваць, але і можа вы памяаеце з прэзентацыі Паўла па якіх фактарах гэта ён можа верыфікаваць. Ён не можа верыфікаваць, калі гэтыя фактары адсутнічаюць. Я сумняюся, што нам трэба сёння прыняць рашэнне па верыфікацыі. Трэба апрацаваць гэта тэхнічна, што мы можам, а што не, каб мы не прынялі сягодня памылковае рашэнне. Я цалкам згодны з тым, што нам трэба быць больш лаяльнымі да выбаршчыкаў. Шмат людзей, шмат розных абставінаў. Калі мы не спяшаемся з гэтым пытаннем, то можам яго перанесцт на наступнае паседжанне.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“Я нагадаю, спадарства, што да выбаршчыкаў мы ніякага дачынення не маем. На гэты працэс мы ніяк не паўплываем. Сёння пытанне, што тычыцца выбаршчых суб’ектаў, допуску людзей да спісаў выбаршчых суб’ектаў вось з усімі гэтымі акалічнасцямі, калі у чалавека, напрыклад, няма пашпарту, калі ён знаходзіцца ў якойсці ўстанове, калі ў чалавека замяст пашпарша ID-карта. Другое пытанне, калі чалавек мае адначасова два ці тры пашпарты. З’яўляецца де-юрэ грамадзянінам Рэспублікі Беларусь, атаксама з’яўляецца грамадзянінам іншай краіны. Яшчэ ў нас ёсць такая акалічнасць як пратэрмінаваныя дакументы, калі людзі з’ехалі ў 20-м годзе і я ны не адмаўляліся ад грамадзянства, не планавалі гэтага рабіць. Яныі маюць на руках беларускі пашпарт, але ён пратэрмінаваны. І для гэтага мы ў працоўным парадку абмяркоўвалі тэрмін 2 гады. Калі гэтае пытанне мы можам разглядзець і прыняць па ім рашэнне, тады добра. Калі не, калі няма такога рашэння ці яно не такое простае, то мае сэнс перанесці.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Зьмітрыя Лазавіка па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“Падсумаванне, у нас будуць чальцы спісаў выбарчых суб’ектаў, якія будуць мець непасрэдны доказ прыналежнасці да грамадзянства Рэспублікі Беларусь. То бок гэта будзе дакумент, з дейсным тэрмінам на сённяшні момант, часцей за ўсё гэта будзе беларускі пашпарт. Другая группа людзей, гэта людзі, якія не выключаны з беларускага грамадзянства, не пазбаўлены беларускага грамадзянства, але такіх беспасярэдных доказаў яны не маюць. То бок для гэтай группы я і прапанаваў падлучыць да гэтай працы нейкіх экспертаў, якія б памаглі нам сабраць нейкія ускосныя доказы, якія будуць падзьцвержваць, што гэты чалавек не выключаны, не пазбаўлены з беларускага грамадзянства, альбо наадварот, пазбаўлены беларускага грамадзянства супраць сваёй волі рэжымам, які гвалтоўна і незаконна захапіў уладу, і тады мы бедзем іх уключаць у гэтыя спісы і яны будуць удзельнічаць у выбарах. Трэцяя группа, людзі, якія добраахвотна выйшлі з беларускага грамадзянства, каб атрымаць грамадзянства іншай краіны, яны нават калі яны паходзяць з Беларусі, то тут мы нічога напэўна не зможам зрабіць.

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“І чацьвёртая группа, гэта людзі якія афіцыйна не выходзілы з грамадзянства, захавалі свае беларускія пашпарты, але маюць грамадзянства іншай краіны.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“Есць яшчэ пятая катэгорыя людзей – гэта людзі, якія не выходзілі з грамадзянства, але страцілі пашпарт. Згубілі, напрыклад. Гэта не лішае грамадзянства беларускага, але ўскладняе нашу працу.

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“Тут на этапе верыфікацыі мы можам запатрабаваць дадатковыя дакументы.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў:

“Падсумую. Адназначнага рашэнні па дадзеным пытанні няма, таму я прапаную прагаласаваць за тое, каб гэтае рашэнне прапрацаваць далей і вынесці далей алгарытм далей. Перанесці гэтае пытанне для далейшых, большых кансультацый.”

Галасаванне па пераносу пытання аб допуску да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў.

Па пытанні № 4 і №5 прагаласавалі:
"За" - 4 галасы, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Перанесці пытанне аб допуске да выбараў беларусаў па паходжанні, якія не маюць беларускіх пашпартоў.

**Разгляд пытання №6.**
СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні спісу "Закон і Правапарадак" ці можна яго лічыць парамілітарным:

“Першапачаткова па спісу паказана, што выканана гендарная квота, але спіс пазыцыянуе сабе як парамілітарная арганізацыя. Толькі там выканана 20 %, а не 40%, як для астатніх. І па сутнасці ў самой заяве прадстаўлена, што гэты спіс складаецца с прадстаўнікоў сілавых ведамстваў, але пры першапачатковым разглядзе там у наяўнасці і іншыя людзі.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Яраслава Бекіша па пытанні спісу "Закон і Правапарадак" ці можна яго лічыць парамілітарным:

“Мы атрымалі заяўку, спіс – усё добра. Гэта першы такі досвед з беларускага боку. Таму гэта нармальна, што ў нас правапрымяняльная практыка яшчэ не напрацаваная. Сапраўды квота выканана ў гэтым спісе як для парамілітарнай арганізацыі. Але ў самой заяуке прадстаўнікі не прэтэндуюць, каб мы ім надалі такі статус. Прапаную ад імя камісіі накіраваць ім два пытання. Ці менавіта претендуюць яны на гэта. Пакуль што не зразумела і нам фармальна трэба атрымаць гэты адказ. На будучыню гэта рекамендаваць і іншым заяўнікам. Калі ласка, калі вы прэтэндуеце на гэты статус, пазначце гэта ў заяўке. Па-другое, не вельмі зразумела колькі людзей з гэтага спіса з 19 чалавек з’яўляюцца людзьмі, якія маюць досвед службы ў сілавых структурах, альбо ў дабраахвотніцкіх сілавых структурах. Наколькі я разумею, мы можам казаць пра трох, мы не можам нічога сказаць аб астатніх 16. Я бы папрасіў перад тым, калі мы будзем прымаць рашэнне, каб заяўнікі патлумачылі, чаму яны прэтэндуюць на гэты статус. Сёння пры тых дадзеных, што там ёсць, нам не дастаткова, каб гэта рашэнне прыняць збалансавана.

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Зьмітрыя Лазавіка па пытанні спісу "Закон і Правапарадак" ці можна яго лічыць парамілітарным:

“У другой палове спісу гендерная квота выконваецца, то бок с 11 па 20 пазіцыі 4 жанчыны. Гэта не наша пытанне. Мы можам прапанаваць шэраг опцый. Я падтрымліваю цалкам калегу, які выступаў. Кантактная асоба ад гэтага суб’екта мусі прадставіць доказы чаму яны пазіцыянуюць сабе як парамілітарную арганізацыю і ці хочуць яны скарыстацца скарочанай гендарнай квотай.”

СЛУХАЛІ: Сябра Выбарчай камісіі Алену Філатаву па пытанні спісу "Закон і Правапарадак" і можна яго лічыць парамілітарным:

“20 адсоткаў – это агульны спіс. Мы не можам выдзеліць дзесятак першы, дзесятак другі. Калі падаецца спіс агулам, то мы гэтыя прапорцыі і улічваем.”

СЛУХАЛІ: Старшыню Выбарчай камісіі Алену Прыходзька па пытанні спісу "Закон і Правапарадак" ці можна яго лічыць парамілітарным:

“Мае значэнне, як людзі ў спісе распалагаюцца. Калі за спіс прагаласуюць, будзе падлічвацца непасрэдна квота на гэты спіс, то гэта будзе граць вялікую ролю і вялікі сэнс. Звычайна мы разглядаем першыя 5 чалавек і каб ад гэтага 40 % былі 2 жанчыны, 20 % квота – 1 жанчына. Што тычыцца спіса “Закон і

правапарадак” квота 20% выканана ўжо ад зараз. І калі браць агулам спіс, ён цягне на 40% квоту і іншым чынам там будуць размеркаваныя чальцы ў спісе. Я пагаджуся з Яраславам, каб нам зразумець намер спадара Аляксандра Азарава, так і чальцоў спіса, нам трэба ў іх запытаць, калі яны лічаць сабе парамілітары, то чаму. Калі не, таму трэба каб інакш склалі свій спіс ці ўдакладнілі яго.”

Галасаванне каб накіраваць да лідару спіса “Закон і правапарадак” Аляксандра Азарава запыт на дадатковую інфармацыю, на абгрунтаванне таго, ці пазыцыянуецца яго спіс як парамілітарны і на падставе чаго, альбо няхай удакладніць спіс ці зменіць яго.

Па пытанні № 6 прагаласавалі:
"За" - 4 галасы, "Супраць" - 0 галасоў, "Устрымаліся" - 0 галасоў.
ВЫРАШЫЛІ: Накіраваць да лідару спіса “Закон і правапарадак” Аляксандра Азарава запыт на дадатковую інфармацыю.

Паседжанне абвешчана закрытым.